УДК 808.26.314.5

Н.Я. Савіцкая, ст. выкладчык

# ЭКАЛОГІЯ СЛОВА

The article contains a short survey of modern science achievements in the field of word ecology. The role of the word is analysed from the points of view of the Bible, folk traditions, nontraditional science.

У Евангеллі ад Іаана
Сказана, што Слова – гэта Бог.
М. Гумілёў

Пытанне экалогіі на сённяшні дзень стала глабальным. Некалькі гадоў назад вядомы рускі эколаг Ф.Я. Шыпуноў прагназаваў экалагічны калапс зямной біясферы, які можа наступіць праз 10–15 гадоў. Мора экалагічных праблем неабсяжнае. Яны лавінападобна нарастаюць, і мы вінаватыя перад лясамі і рэкамі, перад марамі і зямлёй, перад небам і каляземным космасам. І чалавек павінен у тым, што ён стварыў сваім дзеяннем, думкаю, словам.

Як жа слова суадносіцца з агульнай экалагічнай праблематыкай? Які яго экалагічны статус? Што такое экалогія слова – вызначыць не проста з-за шырыні і навізны гэтага паняцця. І хоць навука аб экалогіі слова пакуль яшчэ фарміруецца, усё ж можна адзначыць, што гэта агульная культуралагічная плынь, якая ў апошнія гады паступова павялічваецца і ўсё больш набірае сілу дзякуючы «навуцы аб культуры мовы» акадэміка В.В. Вінаградава, дзякуючы «экалогіі мовы» і «лінгваэкалогіі» (тэрміны 1988 г.) па працах Л.І. Скварцова, В.П. Грыгор'евай, С.І. Вінаградава, В.В. Колесавай, Ю.М. Караулава і іншых, дзякуючы канцэпцыі Ю.М. Лотмана аб «семіясферы» і «онтакамунікацыі» Г.С. Бацішчава. Сам тэрмін «экалогія мовы» ўпершыню з'явіўся, відаць, у 1972 годзе ў працы англічаніна Хаугена (Haugen), а па сутнасці, пытанне моўнай экалогіі ўзняў Гумбальт як лінгвіст, і яшчэ раней яно было ўзнята ў рэлігійных тэкстах з пачатку іх існавання. Зыходзячы з прац названых аўтараў можна сказаць, што экалогія слова – гэта захаванне роднай мовы, яе слоўнага багацця, чысціні, здароўя. Гэта навука пра цэласнасць мовы, пра яе сувязі з культурай свайго народа і разам з тым пра яе сувязь з зямной семіясферай. Гэта навука пра энергетыку слова, пра яго стваральную або разбуральную сілу, пра яго сувязь з біясферай, з мовай жывой прыроды. Гэта, нарэшце, паняцце аб духоўным значэнні слова, яго глыбокай сувязі з асобай, з характарам і лёсам народа, з найвышэйшымі духоўнымі сферамі, з Тварцом. Адсюль становіцца ясна, што біялагічнай, зямной экалогіі не абысціся без экалогіі слова і духа.

У сваю чаргу, экалогія мае шмат роднаснага з біяэкалогіяй і нават грунтуецца на яе тэрміналогіі пры распрацоўцы ўласных тэрмінаў, напрыклад «лінгвацыд», «лексічная эрозія», «моўная алергія».

Крыніцы і традыцыі ўсходнеславянскага асэнсавання метафізікі слова пачынаюцца са Старажытнай Грэцыі. Варта аддаць даніну грэкам, геній якіх меў асобы дар спасціжэння прыроды слова і яго значэння ў свеце. Не выпадкова больш чым за 500 гадоў да н. э. Геракліт Эфескі вучыў, што «ўсё адбываецца па логасу». І філалагія – любоў да слова, навука аб слове – нарадзілася на грэчаскай зямлі. І грэчаскія мысліцелі Прокл, Дыянісій Арэапагіт, а за імі і візантыйскія ісіхасты ўзводзілі вучэнне аб боскіх логасах. Гэта традыцыя прыйшла з Візантыі да ўсходніх славян і праз асветнікаў, а затым дзякуючы праваслаўным філосафам дайшла да нашых дзён, і атрымала далейшае развіццё ў працах Паўла Фларэнскага, С. Булгакава, А.Ф. Лосева, Г.С. Бацішчава, М.К. Пятрова і іншых.

Паспрабуем у агульных рысах ахарактарызаваць дасягненні сучаснай навукі па гэтым пытанні.

Па-першае, вучоныя Вярнадскі, Шардэн, Казначэеў, Хесін і іншыя сфармулявалі паняцце аб глабальным інфармацыйным полі, якое забяспечвае інфармацыяй біясферу і ўсё жывое на ёй. Даказана, што яго складаюць электрамагнітныя палі. Яны ствараюцца жывымі арганізмамі і ўзамадзейнічаюць з навакольнымі электрамагнітнымі палямі, падключаючыся да магнітасферы Зямлі, якая кіруе ўсёй біясферай. Праз яе на зямлян уздзейнічаюць сонечныя ўспышкі і касмічнае выпраменьванне. Эксперыменты паказалі, што па-за магнітным полем Зямлі арганізмы гінуць.

Па-другое, з дапамогай вірусаў гены пераносяцца ад арганізма да арганізма, дзякуючы чаму адбываецца цыркуляцыя генаў у біясферы і ўтвараецца адзіны генетычны фонд біясферы.

Па-трэцяе, гэта сігнальныя малекулы, якія выдзяляюцца рознымі арганізмамі і перадаюць біялагічную інфармацыю: папярэджванне, адпугванне, прыцягванне ўвагі і іншае. Цудоўным носьбітам інфармацыі з'яўляецца вада.

Ёсць чацвёртая частка інфармацыйнага поля, якую называюць біяполем. Яго нельга аднесці ні да электрамагнетызму, ні да хімізму, ні да якога іншага вядомага фізічнага фактару. Некаторыя вучоныя лічаць, што носьбітам палявой інфармацыя з'яўляюцца тарсійныя палі. Яшчэ Вярнадскі сцвярджаў, што жывая матэрыя стварае асобую жывую прастору, якая абдымае ўсю біясферу, абумоўлівае жыццё ўсіх арганізмаў, атрымліваючы ад іх магутны паток энергіі і інфармацыі. Таму гібель кожнай істоты, у тым ліку і слова, адбіваецца на нашым жыцці.

У гэтым ёсць сутнасць усякай экалагічнай сістэмы, якая заўсёды складаецца з жывых і нежывых «элементаў» і існуе да таго часу, пакуль існуе ў ёй біялагічная прастора.

Патокі біялагічнай інфармацыі спрадвеку ахутвалі зямны шар. Яны спараджалі ўсё больш складаныя арганізмы, сярод якіх з'явіліся найвышэйшыя жывёлы і, нарэшце, чалавек – параджэнне інфармацыйнага поля ўсёй біясферы. У ёй узнікла біялагічная мова (гены, медыятары, нейтронныя коды), якая ўзнаўляе ўсю жывую прыроду ад віруса да чалавека. Але прыродзе неабходна было слова, паколькі без яго біялагічная інфармацыя не завершана, бязвольная, яе патокі ідуць як бы аўтаматычна, паднявольна-механістычна.

Мабыць, слова і стварыла чалавека, выдзеліўшы яго з жывёльнага свету. Слова – гэта свабода, прывілея асобы, якая гаворыць, калі палічыць гэта патрэбным, выбірае, што сказаць і як сказаць. Пачынаецца творчасць. Творчасць словам і ў слове. Зямля навучылася слову і стварылася планетарная сфера слова, якая ўзаемадзейнічае з біясферай. Уздзеянне гэта можа быць як стваральным, так і разбуральным. Будзем спадзявацца, што розум словасферы не дапусціць пагібелі біясферы.

Планетарную сістэму слова (словасферу) прынята называць семіясферай. Асноўная адзінка семіясферы – слова. Слова – гэта не проста адзінка інфармацыі, а шматслойныя адзінкі сэнсу, кванты розуму. Слова – аснова духоўнага свету. Яго дзеяннем ствараюцца не толькі творы мастацкай і навуковай літаратуры, але і сам чалавечы свет і яго будучыня. Ствараецца новая сфера, якую Вярнадскі і Тэйяр дэ Шардэн у 20 стагоддзі вызначылі як нешта дзейснае і асаблівае ў планетарнай прасторы і назвалі наасферай. Наасфера Зямлі складаецца з мікронасфер асобных людзей (кожнага чалавека). Кожны носіць вакол сябе нябачную наасферу, якая ў значнай ступені створана са слоў.

У 80-я гады 20 стагоддзя знакаміты філолаг, глава тартускай семіятычнай школы Ю.М. Лотман пасля 25 гадоў даследаванняў фармулюе сугучную наасферы Вярнадскага канцэпцыю семіясферы аб рэальнай прасторы слоў і іншых сэнсавых знакаў, якія ахопліваюць зямны шар. Лотман пісаў: «У гэтым сэнсе семіясфера сучаснага свету, якая непахісна пашыралася ў прасторы на працягу стагоддзяў, прыняла зараз глабальны характар, уключае ў сябе і пазыўныя спадарожнікаў, і вершы паэтаў, і крыкі жывёл. Узаемасувязь гэтых элементаў семіятычнай прасторы не метафара, а рэальнасць». «Семіясфера вызначае мовы народаў і асобных людзей, без яе не можа існаваць ніякая культура, ніякая чалавечая інфармацыя, ні само чалавецтва. У сваіх агульных рысах семіясфера дзіўна нагадвае біясферу. Яна такая ж рэальная, цэласная, усепланетная і вызначальная ў адносінах

да сваіх «элементаў» (моў), мае межы, ядро, памяць, і нават «род «самасвядомасці» і «семіятычную індывідуальнасць» («у гэтым сэнсе можна сказаць, што семіясфера ёсць “семіятычная асоба”»). І далей: «усе ўзроўні семіясферы – ад асобы чалавека ці асобнага тэксту да глабальных семіятычных адзінстваў – уяўляюць сабой як бы ўкладзеныя адна ў адну семіясферы…».

Такім чынам, экалогія слова пачынаецца з глабальнага семіятычнага неба, якое распасціраецца над усім чалавецтвам і над кожным з нас і якое не з’явілася б, каб не было біясферы і яе інфармацыйнага поля. І як кожнаму жывому арганізму, семіясферы патрэбна гармонія.

Але саманадзейнае чалавецтва не разумее гэтага, спяшаючыся рацыяналізаваць, тэхнізаваць слова і тым самым змярцвіць мову. Словы мелі шматслойны, множнасны сэнс, а зараз сталі рацыянальнымі, яны згубілі святасць і каштоўнасць, набыўшы ўзамен цану. Знявечанае слова ў любой краіне разбурае свет людзей, жывёл і раслін – разбурэнне прыроды ўсюды пачынаецца з разбурэння слова.

Экалогія слова шматструйная, як рака. Гэта не толькі глабальны абхват планетарнай семіясферы. Чаму, напрыклад, васілёк увесь час застаецца васільком, а заяц зайцам? Іх ахоўвае спадчынны код, гены. І кожны народ таксама, каб пастаянна адраджацца і самааднаўляцца павінен мець для гэтага спадчынны код, падобны на гены біялагічнага арганізма. І гэты код без слова, без нацыянальнай мовы не існуе. І народ пачынаецца з мовы.

У геноме беларускай культуры неацэннай каштоўнасцю з’яўляюцца народная мова казак, песень, прыказак, міфалогіі. Для прыкладу прывядзём некалькі прыказак, звязаных з разуменнем ролі слова: «Са свайго языка спусціш – на чужым не зловіш», «Сліны не падымеш, а слова не вернеш», «Словы – гужы, за сэрца цягнуць», «Ліхое слова пракаўтні», «Куляй пацэліш у аднаго, у двух, а трапным словам у тысячу». Шэраг прыведзеных прыказак аб слове – сведчанне разумення беларусамі яго ролі і паказчык нацыянальнай адметнасці мовы.

Усе мы ведаем, што ў Евангеллі ад Іаана сказана, што Слова – гэта Бог. З іншых тэкстаў Бібліі можам даведацца, што Бог Словам стварыў чалавека і чалавеку (адзінаму з усіх жывых істот) даў магчымасць тварыць словам, даў яму мову. Найвялікшую ролю слова пацвярджаюць тэксты амаль усіх рэлігій свету і шматлікіх духоўных вучэнняў, а сучасная навука з дапамогай навейшых прыбораў і тэхналогій пацвярджае сказанае Біблій.

Некалькі дзесяцігоддзяў назад «У пасланні Грааля» Абд-ру-шын, разважаючы аб ролі слова, пісаў: «Словы, якія вы ствараеце, фразы, якія вы вымаўляеце, ствараюць знешні выгляд вашага лёсу на гэтай Зямлі. Яны як пасевы ў садзе, які вы вырошчваеце вакол сябе; паколькі кожнае чалавечае слова – гэта жывая істота, якая можа дзейнічаць для вас у гэтым Тварэнні.

Выкарыстанне слоў – у руках чалавека згодна з яго свабоднай воляй, аднак уздзеянне слоў – яму ўжо непадуладна».

Народная мудрасць таксама пацвярджае вялікую ролю слова: «Слоўка як птушка: выпусціў – не вернеш», «Як брыдкае слова сказаць, лепш язык выплюнуць», «Дай Божа ў добры час сказаць, а ў ліхі памаўчаць», «Добрае слова не забываецца», «Рана загоіцца, а злое слова ніколі», «Удар забудзеш, а злое слова ніколі», «Ні мовы, ні гловы», «Якая птушка, такі і галасок», «Які розум, такая і гаворка», «Ласкавае слова – што ясны дзень».

Для нашага жыцця гэтыя словы з'яўляюцца папярэджаннем: неабходна гаварыць правільна і ўсвядомлена, пазбягаць напоўненых дрэннымі эмоцыямі непрыстойных слоў і не гаварыць пустое, не пляткарыць – не памнажаць тоны слоўнага смецця, якое абавязкова вернецца да таго, хто спарадзіў яго ў свет.

Сіла слова ўвогуле здольна дзейнічаць гаючa як у адносінах з іншымі людзьмі, так і ў рашэнні ўласных праблем. У ходзе назіранняў даследчыкі ўстанавілі, што ўсвядомленае ўжыванне слова змяняе таксама энергетычнае поле чалавека, яго аўру. Устаноўлена, што элемент вады чуйна рэагуе на эмоцыі і словы, таму нядзіўна, што наш арганізм, які склада-

ецца амаль на 80% з вады, успрымае сігналы ад слоў, думак і пачуццяў у лепшых выпадках як гаючыя, стваральныя імпульсы, у горшых – як разбуральныя.

У пацверджанне сказанага прывядзём толькі адзін прыклад са шматлікіх эксперыментаў – фатаграфіі структуры малекул вады пад мікраскопам, зробленыя японцам Масару Эмота, на якіх паказана ўздзеянне слоў і экалогіі на структуру вады.



Рыс. 1. У левым ніжнім вугле – брыдкая форма, якая ўзнікае ад брудных слоў «Ты мяне дастаў, я цябе заб'ю!» Уверсе форма крышталя, якая ўтварылася пасля вымаўлення слоў любві і падзякі



Рыс. 2. У левым ніжнім вугле – форма крышталя бруднай вады з гарадскога канала; уверсе – тая ж вада пасля прачытання над ёй інтэнсіўнай малітвы

Характар маўленчай дзейнасці яшчэ не да канца даследаваны сучаснай навукай. Але мы маем ужо дастаткова фактаў, каб пацвердзіць значэнне і ролю Слова, якое надаюць яму і Біблія, і народная мудрасць, і эзатэрычныя навукі. Фактычна, усе крыніцы ведаў сыходзяцца на сцвярджэнні выключнасці ролі Слова. А экалогія слова ў тым, каб прамаўляць яго без злосці і зняважы, без скажэння сэнсу, прамаўляць з дабром і радасцю, шчырасцю і любоўю, несучы ў будучыню ўсё лепшае, што напрацавана продкамі за тысячагоддзі.

ЛІТАРАТУРА


1. Афанасьев В.В. Просвещая разум и сердце // Литературная учеба. Кн. 5–6. – 1997. – С. 86–93.

2. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Ф.М. Янкоўскі. – Мн.: АН БССР, 1962. – 253 с.

3. Зюрняева Т.Н. Защитная сила слова. – Санкт-Петербург: А.В.К. – Тимошка, 2003. – С. 5–11.

4. Козлович Л. Велика сила слова // Вечерний Минск. – 2002. – 17 сентября.

5. Коржицкий С. Целительная сила слова // Чистый мир. – 2003. – 12 декабря. – С. 5.

6. Лотман Ю.М. Избранные статьи. Кн. 1. – Таллинн, 1992. – С. 20.

7. Миловатский В.С. Об экологии слова. – М.: Просветитель, 2001. – 63 с.

8. Нафрановіч А. Бэсціць мову – вялікі грэх // Звязда. – 2002. – 25 чэрвеня.

9. Невярович В.К. Исцеление словом. – М.: Русскій хронографъ, 2000. – 218 с.

10. Писарук Г.В. …И Слово в сердце отзовется… – Мн.: Беларусь, 2002. – С. 3.

11. Прохатская Л. Храните от скверны уста // Вечерний Минск. – 2002. – 6 августа. – С. 1, 3.

12. Ремнева М.Л., Комлев Н.Г. Универсум филологии: язык, общество, наука // Вестник МГУ. Филогия (сер. 9). – 1997. – № 2. – С. 59.

13. Успенский Б.А. Мифологический аспект экспрессивной фразеологии. – В кн.: Избранные труды. Т. 2. – М., 1996.

14. Федотов А. Эпоха глобальной экологической катастрофы и модель мировой системы, способы ей противостоять // Диалог. – № 2. – С. 9–11.

15. Яковленко С.И. Проблемы качества энергии // Вопросы философии. – 1994. – № 9. – С. 11.

16. Янкоўскі Ф. Само слова гаворыць: філалагічныя эцюды, абразкі, артыкулы. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1986. – 318 с.